Юлія Пераверзева



Загадчык аддзела
Нацыянальнай
бібліятэкі Беларусі

Марыянна Жукоўская



Загадчык сектара
Нацыянальнай
бібліятэкі Беларусі

# Унутрырэспубліканскі дакументаабмен і пераразмеркаванне дакументаў: актуальныя пытанні практыкі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

Дзейнасць Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (НББ) па ажыццяўленні ўнутрырэспубліканскага дакументаабмену і пераразмеркавання дакументаў па сваёй сутнасці з'яўляецца сістэмаўтваральнай у адносінах да бібліятэк краіны.

На пачатку 1930-х гг. пры Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя У.І. Леніна пачаў фарміравацца цэнтральны абменны фонд, які з цягам часу стаў важкім інструментам у сістэме фарміравання і развіцця фондаў бібліятэк рэспублікі розных тыпаў і відаў. Больш чым за 85-гадовы прамежак часу здзяйсненне работы, звязанай з дакументаабменам і пераразмеркаваннем дакументаў у НББ, знаходзілася пад уздзеяннем як знешніх (палітычных, эканамічных, сацыякультурных) фактараў, характэрных для пэўных гістарычных перыядаў, так і ўнутраных кіраўніцкіх, структурна-арганізацыйных асаблівасцей бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці, звязанай з камплектаваннем бібліятэчных фондаў.

Сучасная НББ – цэнтр унутрырэспубліканскага дакументаабмену і пераразмеркавання дакументаў. Бібліятэка мае адпаведны фонд, які ў якасці дапаможнага ўваходзіць у сістэму яе фондаў і калекцый і з'яўляецца дублетным, службовым. На 1 студзеня 2016 г. ён налічваў без малога 79 тыс. экз. універсальных па змесце і розных па відавой прыналежнасці дакументаў на беларускай, рускай і замежных мовах.

Дзейнасць бібліятэкі па ўнутрырэспубліканскім дакументаабмене і пераразмеркаванні дакументаў дакладна структуравана і мае трывалую арганізацыйна-нарматыўную базу:

• фарміраванне, улік, захаванне і выкарыстанне фонду ажыццяўляюцца спецыялістамі сектара ўнутрырэспубліканскага дакументаабмену і пераразмеркавання дакументаў аддзела камплектавання фондаў, якія маюць профільную адукацыю і выконваюць свае прафесійныя функцыі згодна з дакладна вызначанымі ў службовых інструкцыях правамі і абавязкамі;

• нарматыўна-прававое рэгуляванне бібліятэчнай работы, звязанай з вызначэннем складу, структуры, механізмаў развіцця і ўліку фонду ўнутрырэспубліканскага дакументаабмену і пераразмеркавання дакументаў, вызначаецца палажэннямі Закона Рэспублікі Беларусь «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь», Статута дзяржаўнай установы «Нацыянальная бібліятэка Беларусі», Адзінага профілю камплектавання сістэмы фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі; Інструкцыяй па ўліку і захаванасці фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Інструкцыяй аб парадку ажыццяўлення ўнутрырэспубліканскага дакументаабмену і пераразмеркавання дакументаў; нормамі дакументаў «Положение об обязательном бесплатном экземпляре документов», «Палажэнне аб аддзеле камплектавання фондаў», «Палажэнне аб сектары ўнутрырэспубліканскага дакументаабмену і пераразмеркавання дакументаў аддзела камплектавання фондаў», «Палажэнне аб фондзе ўнутрырэспубліканскага дакументаабмену і пераразмеркавання дакументаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі»;

• склад і структура фонду падначалены вырашэнню такіх задач, як рацыянальнае выкарыстанне бязвыплатных крыніц камплектавання, аптымальнае размеркаванне сукупнага бібліятэчнага фонду краіны, дакамплектаванне бібліятэк рэспублікі розных тыпаў і відаў, прапаганда навуковай, грамадскай, мастацкай каштоўнасці кнігі, выхаванне маральна-этычных якасцей асобы карыстальніка праз далучэнне яго да чытання, набліжэнне твораў друку да насельніцтва і інш.;

• фонд размяшчаецца ў спецыяльна абсталяваным памяшканні (кнігасховішчы), дзе падтрымліваецца неабходны тэмпературна-вільготнасны і санітарна-гігіенічны рэжымы, дзейнічае сістэма супрацьпажарнай бяспекі і аховы;

• мадэль фарміравання фонду ўнутрырэспубліканскага дакументаабмену і пераразмеркавання дакументаў НББ прадстаўлена наступнымі блокамі: нацыянальныя дакументы, экстэрыёрыка (беларусіка), дакументы краін СНД, дакументы краін далёкага замежжа. У фонд уключаюцца грамадска значныя выданні незалежна ад іх відавой і моўнай прыналежнасці, якія выйшлі ў свет у канцы XIX – пачатку XXI ст. Пры гэтым экзэмплярнасць выданняў, што ў яго накіроўваюцца, не абмежавана.

Асноўнымі крыніцамі камплектавання фонду ўнутрырэспубліканскага дакументаабмену і пераразмеркавання дакументаў НББ з'яўляюцца:

• дары – у 2010 г. гэта крыніца забяспечыла 60,7% паступленняў, у 2015 г. – 64%;

• унутрырэспубліканскі дакументаабмен Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі з бібліятэкамі-партнёрамі – за 2010–2015 гг. прырост фонду склаў амаль 5%;

• дублеты абавязковага бясплатнага экземпляра – паступленні не менш за 10,5% штогод;

• за кошт унутраных рэзерваў фонд папаўняецца кожны год больш, чым на 3% і інш.

Важкай асаблівасцю функцыянавання фонду ўнутрырэспубліканскага дакументаабмену і пераараз-

меркавання дакументаў з'яўляецца яго дынамізм, у выніку чаго змены яго складу могуць быць значнымі ў межах аднаго каляндарнага года. Тым не менш тэматычны ахоп дакументнага патоку па галінах ведаў прадстаўлены шырокім спектрам грамадскіх, прыродазнаўчых, тэхнічных друкаваных асобнікаў, творамі мастацкай літаратуры, выданнямі па культуры і мастацтве (напрыклад, альбомы), энцыклапедычнай і даведачнай літаратурай, падборкамі часопісаў і кнігамі даваеннага перыяду, аўдыявізуальнымі і выяўленчымі дакументамі, нарматыўна-тэхнічнай дакументацыяй, аўтарэфератамі беларускіх і замежных дысертацый. Дакументы, якія выдадзены ў апошнія 2–3 гады, складаюць 60% ад фонду. Згодна са статыстычнымі данымі фонд нельга лічыць статычным.

Ад бібліятэк Беларусі ў фонд унутрырэспубліканскага дакументаабмену і пераразмеркавання дакументаў НББ штогод пастурае пэўная колькасць экзэмпляраў дакументаў. За апошнія шэсць гадоў паказчык паступленняў дакументаў павялічыўся амаль на 7 тыс. адзінак (мал. 2). Асноўнымі партнёрамі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі па ўнутрырэспубліканскім дакументаабмене з'яўляюцца Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь, Навукова-педагагічная бібліятэка ГІАЦ Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Рэспубліканская навуковая медыцынская бібліятэка, бібліятэка Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, Фундаментальная бібліятэка БДУ, Абласная бібліятэка імя М. Горкага г. Брэста. Вельмі станоўча, што пэўная колькасць пераразмеркаваных дакументаў папаўняе асноўны фонд галоўнай бібліятэкі краіны.

Адзначым, што склад дакументнага патоку паступленняў у фонд унутрырэспубліканскага дакументаабмену і пераразмеркавання дакументаў НББ прадстаўлены рознымі відамі дакументаў. Пры гэтым сярод паступленняў на працягу шасцігадовага перыяду прэваліруюць кнігі, часопісы, дакументы групавой апрацоўкі (у асноўным рэкламна-ліставыя матэрыялы).

У фонд накіроўваюцца празмерна дублетныя і няпрофільныя экзэмпляры, якія паступаюць у Нацыянальную бібліятэку Беларусі па розных каналах, у тым ліку грамадска значныя выданні, што ў бібліятэку перадаюць міжнародныя фонды, пасольствы, арганізацыі розных форм уласнасці, прыватныя асобы. Сярод іх – Адміністрацыя Парка высокіх тэхналогій, Выдавецкі савет Беларускай праваслаўнай царквы, Фонд эканамічнай узаемадапамогі краін СНД, Урад г. Масквы і г. д. Асобна трэба адзначыць уклад пісьменніка В.Ц. Якавенкі ў папаўненне фонду. Ён у 2015 г. перадаў больш за 1 тыс. экз. кніг, дзе асвятляюцца актуальныя праблемы жыцця грамадства, аналізуецца яго гістарычны лёс, робяцца прагнозы развіцця ў філасофска-культурным кантэксце.

Неабходна сказаць, што ў апошні час супрацоўнікі сектара ўнутрырэспубліканскага дакументаабмену і пераразмеркавання дакументаў працуюць з літаратурай, якая паступае ў фонд з бібліятэк краіны, якія падпалі пад структурную аптымізацыю. Толькі ў 2014 г. НББ атрымала больш за 30 тыс. экз. дакументаў, якія, у сваю чаргу, былі перададзены ў іншыя бібліятэчныя ўстановы, дзе яны запатрабаваны.

У 2015 г. каля 200 бібліятэк Беларусі атрымалі ад Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі больш за 88 тыс. выданняў з фонду ўнутрырэспубліканскага дакументаабмену і пераразмеркавання дакументаў. За шэсць гадоў (2010–2015) бібліятэкам розных тыпаў і відаў у адпаведнасці з іх запытамі перададзена больш за 460 тыс. экз. дакументаў. Бібліятэкі ўстаноў сацыяльнага тыпу – 42 515; бібліятэкі Міністэрства абароны – 30 161; бібліятэкі Міністэрства ўнутраных спраў – 15 559; рэспубліканскія галіновыя бібліятэкі – 85 165; бібліятэкі сеткі Міністэрства адукацыі – 138 604; бібліятэкі сеткі Міністэрства культуры – 148 885.

У структуры фонду ўнутрырэспубліканскага дакументаабмену і пераразмеркавання дакументаў сфарміравана калекцыя выданняў, якія прапануюцца бібліятэкам узамен на неабходныя для Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. На партале бібліятэкі ў раздзеле «Бібліятэкарам» штомесячна размяшчаюцца актуалізаваныя тэматычныя спісы і штоквартальна абнаўляецца змест «Паказальніка дакументаў, якія прапануюцца для пераразмеркавання». Незалежна ад таго, што тэматычныя спісы ўключаюць у асноўным рэтраспекцыю, а паказальнік – новыя выданні, попыт на бібліяграфічную інфармацыю рознай храналогіі практычна аднолькавы. Пры гэтым каля 70% дакументаў, якія прапануюцца для абмену аператыўна запрошваюцца і перадаюцца бібліятэкам рэспублікі.

Безумоўна, работа па арганізацыі ўнутрырэспубліканскага дакументаабмену і пераразмеркавання дакументаў мае гуманітарную накіраванасць і сацыяльную значнасць для грамадства, бо садзейнічае фарміраванню фондаў бібліятэк і эканоміі бюджэтных сродкаў на камплектаванне.

Калі Вы вырашылі выкарыстаць магчымасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і дакамплектаваць фонд бібліятэкі, у якой працуеце, то павінны мець на ўвазе наступнае:

- экзэмплярнасць выданняў, што Вы можаце перадаць у фонд унутрырэспубліканскага дакументаабмену і пераразмеркавання дакументаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, не абмежавана, але выданні павінны быць у добрым фізічным стане, без пашкоджанняў і дэфектаў;
- супрацоўнікі бібліятэк, інфармацыйных цэнтраў і іншых арганізацый дапускаюцца ў фонд унутрырэспубліканскага дакументаабмену і пераразмеркавання дакументаў для прагляду і адбору дакументаў на аснове папярэдняга пісьмовага запыту на імя дырэктара/намесніка дырэктара па інфармацыйных рэсурсах і па ўзгадненні з адміністрацыяй бібліятэкі;
- дакументаабменныя аперацыі паміж бібліятэкамі, інфармацыйнымі цэнтрамі і іншымі ўстановамі афармляюцца адпаведнымі актамі, да якіх дадаюцца спісы (пералікі) дакументаў;
- Нацыянальная бібліятэка Беларусі не ажыццяўляе дастаўку дакументаў партнёрам па ўнутрырэспубліканскім дакументаабмене;
- дакументы з фонду перадаюцца арганізацыям-партнёрам, у тым ліку беларускім суполкам, таварыствам, якія знаходзяцца за межамі краіны, бязвыплатна, а таксама на аснове эквівалентнага абмену ў адпаведнасці з дамовамі, пагадненнямі і іншымі пісьмова аформленымі запытамі;
- найноўшая інфармацыя аб складзе фонду і дакументах, прызначаных для пераразмеркавання, прадстаўлена на http://www.nlb.by/portal/page/portal/index/content?lang=ru&classId=ABD92003A71B409CA17D9DAFF8D6BEB1;
- кантактная інфармацыя:

супрацоўнікі сектара ўнутрырэспубліканскага дакументаабмену і пераразмеркавання дакументаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі:
Тэл. (+375 17) 293 25 83,
e-mail: jukovskaya@mail2.nlb.by.

Summary

The experience and questions of intra-document exchange.